**Таццяна Кузьмініч**

**Намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт**

**Валянціна Саітава**

**Дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук**

# Лакальныя электронныя калекцыі як сродак стварэння крыніцазнаўчай базы гістарычных і краязнаўчых даследаванняў (на прыкладзе Памятных кніжак беларускіх губерняў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэка ўдзельнічае ў захаванні гісторыка-культурнай памяці грамадства праз даволі шырокі спектар дзеянняў: кумуляванне і захаванне сацыяльна значнай дакументаванай прадукцыі, яе апрацоўку і ўпарадкаванне атрыманай другаснай інфармацыі, фарміраванне фактаграфічных ведаў аб аўтарах тэкстаў, іх ідэях, канцэпцыях і інш. Яна спрыяе таксама і актуалізацыі асобных пластоў дакументаванай інфармацыі. Апошняе адбываецца шляхам як стварэння і пераўтварэння бібліяграфічных ведаў аб раней створанай дакументнай прадукцыі, так і алічбоўкі саміх дакументаў і фарміравання адпаведных калекцый. Прычым такія калекцыі можна рабіць больш поўнымі, чым самі друкаваныя ці рукапісныя зборы, што будзе садзейнічаць фарміраванню грунтоўных крыніцазнаўчых даследаванняў. Да таго ж электронныя формы прадстаўлення інфармацыі дазваляюць забяспечыць карыстальніку аптымальна зручны інфармацыйна-пошукавы рэжым, сабраць вялікі масіў лічбавых копій дакументаў, спалучыць бібліяграфічную, фактаграфічную і поўнатэкставую інфармацыю, забяспечыць яе каментарыямі, зрокавымі і гукавымі асацыятыўнымі інфармацыйнымі радамі.

У дадзеным артыкуле мы прапануем аналіз падыходаў да стварэння падобных калекцый на прыкладзе электронных выданняў «Памятныя кніжкі ...» беларускіх губерняў другой паловы XIX – пачатку XX ст. – Віцебскай [1], Мінскай [2] і Магілёўскай губерняў [3][1].

Памятныя кніжкі беларускіх губерняў адносяцца да гістарычных крыніц фактаграфічнага характару, якія ўтрымліваюць разнапланавыя звесткі аб асобных частках этнічных беларускіх тэрыторый. Гэта адзін з вынікаў работы губернскіх статкамітэтаў, якія пачалі ствараццa ў 1834 г. як органы наладжваемай у Расійскай Імперыі сістэмы збору і апрацоўкі статыстычных даных. Таксама перад статыстычнымі камітэтамі ставіліся задачы па выяўленні і апісанні мясцовых гістарычных помнікаў.

Памятныя кніжкі выходзілі з сярэдзіны XIX ст. да 1916 г.: Віцебскай губерні – у 1861–1914 гг., Гродзенскай – у 1847–1915 гг., Магілёўскай – у 1853–1916 гг., Мінскай – у 1845–1916 гг. Выданні даведнікаў у Віленскай губерні пачаліся ў 1845 г. і доўжыліся да 1915 г. Часам па розных прычынах выданне прыпынялася, а праз некаторы час узнаўлялася. Адбываліся таксама і змяненні назваў[2].

Для сучасных гісторыкаў і краязнаўцаў гэтыя выданні прадстаўляюць значны інтарэс як крыніцы, якія ўтрымліваюць вялікія пласты інфармацыі аб насельніцтве, прыродных умовах і эканамічным развіцці рэгіёнаў, даведачныя матэрыялы (адрасы ўстаноў, прадпрыемстваў, вайсковых частак, службовых асоб і інш.), тэксты палажэнняў, інструкцый, правілаў і іншых дакументаў мясцовай улады. Такія звесткі дапамагаюць даследчыку прааналізаваць змяненні, якія адбываліся ў губерні на працягу значнага часовага перыяду не толькі ў шырокім плане, але і па вузкіх пытаннях. Адметную частку матэрыялаў памятных кніжак складаюць публікацыі мясцовых краязнаўцаў, сярод якіх артыкулы і тэксты гістарычных першакрыніц.

Для сучасных даследчыкаў гэты багаты фактаграфічны матэрыял можа выкарыстоўвацца разам з іншымі крыніцамі ў гісторыка-аналітычных і краязнаўчых даследаваннях. Нельга таксама недаацэньваць значэнне памятных кніжак для адукацыйнай і асветніцкай дзейнасці, уласцівай гісторыкам і краязнаўцам.

[1] Кампакт-дыскі, прысвечаныя памятным кніжкам Віленскай і Гродзенскай губерняў, выпушчаны Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі (НББ) у 2012 г.

[2] Памятныя кніжкі Мінскага губстаткамітэта на 1889, 1892–1894 і 1900–1904 гг. выходзілі пад назвай «Памятная книжка и календарь Минской губернии», на 1869 і 1909–1917 гг. – «Памятная книжка Минской губернии и календарь». У Віцебскай губерні адпаведны даведнік на 1862 г. выходзіў пад назвай “Памятная книжка Витебской губернии”, на 1890 г. – «Адрес-календарь Витебской губернии». У Магілёўскай губерні – пад назвай «Адрес-календарь Могилевской губернии на 1876 год», «Адрес-календарь и памятная книжка Могилевской губернии на 1905 год», «Памятная книжка и календарь Могилевской губернии на 1908 год». Найчасцей змяняліся назвы ў даведніку Гродзенскага губстаткамітэта: на 1858–1866, 1869, 1874 (ч. 1–2), 1875 (ч. 1), 1876 (ч. 1), 1877 (ч. 1), 1878 (ч. 1), 1890–1910 гг. былі выдадзены «Памятная книжка Гродненской губернии», на 1867 г. «Адрес-календарь служащих в Гродненской губернии лиц гражданского, военного и духовного ведомства», на 1879–1889 гг. «Памятная книжка Гродненской губернии. Адрес-календарь и статистическо-справочные сведения». Вар'іраваліся назвы і ў «Памятной книжке Виленской губернии» (напрыклад, «Памятная книжка Виленской губернии на 1878 год. Адрес-календарь и статистическо-справочные сведения» і інш.).

Усведамляючы адказнасць за якасць інфармацыйнага забеспячэння гістарычнай навукі і краязнаўства, НББ ажыццяўляе шэраг праектаў, мэтай якіх з'яўляецца стварэнне поўнай, надзейнай, зручнай і шырока даступнай для карыстальнікаў крыніцазнаўчай рэсурснай базы гэтых галін. На бягучы час у межах фарміравання Нацыянальнай электроннай бібліятэкі НББ падрыхтавала паўнатэкставы электронны масіў «Крыніцы па гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.», у якім больш за 4 тыс. электронных копій найбольш каштоўных і рэдкіх дакументаў [4]. З максімальнай паўнатой прадстаўлены штогоднікі-даведнікі – губернскія памятныя кніжкі Беларусі.

Работа па стварэнні калекцыі памятных кніжак беларускіх губерняў вядзецца супрацоўнікамі НББ пры падтрымцы фонду «Русский мир» са снежня 2010 г.

Перад НББ стаяла задача выявіць з вычарпальнай паўнатой звесткі аб усіх выпусках памятных кніжак беларускіх губерняў. Былі адабраны і сканіраваны выпускі памятных кніжак, якія захоўваюцца ў НББ. На жаль, у фондах бібліятэкі няма поўных камплектаў арыгіналаў гэтых выданняў. Найбольш поўным зборам з пункту гледжання храналагічнага ахопу з'яўляюцца «Памятные книжки Витебской губернии» – звыш 80% ад усяго выдання. Шмат друкаваных памятных кніжак знаходзіцца ў іншых бібліятэках і архівах Беларусі, а таксама ў бібліятэках Літвы, Расіі і іншых краін. Яны таксама былі выяўлены, што забяспечыла поўны склад кожнага выдання. Былі заключаны дамоўленасці з Фундаметальнай бібліятэкай БДУ, Цэнтральнай навуковай бібліятэкай НАН Беларусі, Прэзідэнтскай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь, Расійскай нацыянальнай бібліятэкай, бібліятэкай Вільнюскага ўніверсітэта, Гродзенскай абласной бібліятэкай імя Я.Ф. Карскага.

Па дамоўленасці бакоў арыгіналы выданняў сканіраваліся супрацоўнікамі НББ – удзельнікамі праекта. Плённыя прафесійныя стасункі з замежнымі бібліятэкамі дапамаглі станоўча вырашаць пытанні, якія ўзнікалі з-за прагалаў у камплектах друкаваных памятных кніжак у НББ. Напрыклад, падчас работы над стварэннем калекцыі памятных кніжак Віцебскай губерні ў межах падпісаных пагадненняў з бібліятэкай Вільнюскага ўніверсітэта, Расійскай нацыянальнай бібліятэкай былі атрыманы лічбавыя копіі тых дакументаў, якія адсутнічаюць у фондасховішчах Беларусі.

Такім чынам, узаемадзеянне з іншымі кнігасховішчамі дазволіла НББ ліквідаваць прагалы і стварыць якасныя лічбавыя копіі поўных камплектаў памятных кніжак беларускіх губерняў.

Увесь сабраны і апрацаваны масіў лічбавай інфармацыі быў пакладзены ў аснову электронных выданняў на кампакт-дысках. Электроннае выданне дазволіць адлюстраваць лічбавыя копіі ўсіх выпускаў, уключыць гістарычныя даведкі і навуковыя публікацыі па тэме, ілюстрацыйны і музычны матэрыял. У якасці ілюстрацый выкарыстаны выяўленчыя дакументы сярэдзіны XIX – пачатку XX ст. з фондаў НББ: карты, планы, гербы, партрэты, паштоўкі, малюнкі з відамі гарадоў, помнікаў архітэктуры і інш. Узнаўляюць гістарычную эпоху фрагменты музычных твораў кампазітараў XIX ст., жыццё і творчасць якіх цесна звязаны з Беларуссю: К. Ельскага, М. Ельскага, О. Казлоўскага, С. Манюшкі, К. Марцінкевіч, М.К. Агінскага, Н. Орды, Л. Скрабецкага.

Ілюстрацыйны матэрыял і гукавае суправаджэнне ствараюць эфект «прысутнасці ў часе і прасторы», што станоўча ўплывае на эмацыянальны настрой даследчыка і асобаў, якія займаюцца іншымі відамі пазнавальнай дзейнасці.

Выданне «Памятные книжки Витебской губернии. (1861–1914)» уключае даведачна-пошукавы апарат: дапаможныя паказальнікі аўтараў артыкулаў і гістарычных матэрыялаў і аўтараў артыкулаў з кароткімі біяграфічнымі звесткамі, якія забяспечваюць хуткі пошук арыгінальных аўтарскіх прац і гістарычных першакрыніц, змешчаных на старонках памятных кніжак.

Усе прадстаўленыя на кампакт-дыску матэрыялы размешчаны ў электроннай бібліятэцы НББ як частка асобнай калекцыі «Перыядычны друк Беларусі другой паловы XVIII ст. – 1917 г.». Забяспечаны доступ да гэтых матэрыялаў і праз электронны каталог НББ. Кампакт-дыскі распаўсюджаны таксама сярод бібліятэк абласцей краіны.

Падкрэслім, што друкаваных аналагаў гэтых калекцый у Беларусі няма. Таму іх электронныя выданні ўпершыню адкрылі перад даследчыкамі магчымасць вывучаць гістарычныя з'явы на аснове вялікага і ўнікальнага масіва звестак, паслядоўнасць якіх дакладна ўзноўлена ў храналагічным развіцці.

ЛІТАРАТУРА

1. **Саітава, В. І.** Памятныя кніжкі беларускіх губерняў: агульная характарыстыка / В. І. Саітава, Т. В. Страмужэўская // Памятные книжки Витебской губернии (1861–1914) [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси. – Электронные текстовые, графические данные и программа (2,62 Гб). – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2011. – 1 электронный оптический диск (DVD-ROM). – Системные требования: Intel Pentium II 400 ; RAM 64 ; SVGA ; Windows 98. – Заглавие с титульного экрана.

2. **Саітава, В. І.** Памятныя кніжкі беларускіх губерняў: агульная характарыстыка / В. І. Саітава, Т. В. Страмужэўская // Памятные книжки Минской губернии (1845–1916) [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси. – Электронные текстовые, графические данные и программа (4,05 Гб). – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2011. – 1 электронный оптический диск (DVD-ROM). – Системные требования: Intel Pentium II 400 ; RAM 64 ; SVGA ; Windows 98. – Заглавие с титульного экрана.

3. **Саітава, В. І.** Памятныя кніжкі беларускіх губерняў: агульная характарыстыка / В. І. Саітава, Т. В. Страмужэўская // Памятные книжки Могилевской губернии (1853–1916) [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси. – Электронные текстовые, графические данные и программа (3,8 Гб). – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2011. – 1 электронный оптический диск (DVD-ROM). – Системные требования: Intel Pentium II 400 ; RAM 64 ; SVGA ; Windows 98. – Заглавие с титульного экрана.

4. **Кузьминич, Т. В.** Цифровые коллекции НББ как основа формирования контента Национальной электронной библиотеки Беларуси / Кузьминич Татьяна Васильевна и др. // Бібліятэчны веснік: [зборнік артыкулаў] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; [рэдкалегія Р. С. Матульскі (старшыня) і інш.]. – Мінск, 2010–2011. – С. 151–159.

**Summary**

In the article the analysis of the approaches to creation of digital collections on the example of publications of The Memorable Books of the Belarusian Provinces is offered.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ